**N.A. Yablokov**
Vitebsk State University named after P.M. Masherov
e-mail: UvaoTyan@yandex.by

## The ontology of internet literature and its creative democratization

*Key words: internet literature, properties of internet literature, essence of internet literature, structure of internet literature, literary studies, creativity, democratization.*

*The article analyzes internet literature as a subject of study. It examines its essence, properties, and structure, and also compares these properties with canonical, paper literature. Attention is also given to the theme of creative democracy as one of the main components of internet literature.*

**М.В. Яромка**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
e-mail: maryna.yaromka@gmail.com

УДК 821.161.3

# КАНЦЭПЦЫЯ МАРАЛІ Ў АПОВЕСЦІ В. БЫКАВА «ЗНАК БЯДЫ»

*Ключавыя словы: апазіцыя «дабро – зло»; апазіцыя «свой – чужы»; Васіль Быкаў; «Знак бяды»; канцэпцыя маралі.*

*Артыкул раскрывае канцэпцыю маралі ў аповесці В. Быкава «Знак бяды», якая характарызуецца лакальнасцю (прывязанасцю да знаёмага свету), спалучэннем хрысціянскай традыцыі і «людскай» маралі, заснаванай на досведзе жыцця ў сялянскай культуры. Праблема дабра і зла раскрываецца праз маральныя якасці персанажаў, адсылкі да Бібліі, матывы граху і выкуплення, сэнсавую нагрузку пытанняў «чаму» і «за што».*

Мараль як сукупнасць прынцыпаў і каштоўнасцей, паводле якіх выбудоўваюцца адносіны з іншымі людзьмі, з'яўляецца складнікам канцэпцыі чалавека, што выяўляецца ў мастацкім творы. Маральна-філасофскаму аспекту творчасці В. Быкава прысвечаная праца Е. Лявонавай, дзе творы пісьменніка суадносяцца з традыцыяй Ф. Дастаеўскага, адзначаюцца агульныя рысы і разыходжанні твораў В. Быкава з ідэямі французскага экзістэнцыялізму [2]. Маральныя якасці герояў выкарыстоўваюцца як крытэрый для тыпалогіі персанажаў у артыкуле З. П. Мельнікавай [3], аднак цэласна канцэпцыя маралі ў аповесці не даследавалася.

Мараль у аповесці В. Быкава «Знак бяды» шчыльна звязаная з рэлігіяй. Хрысціянскі кантэкст прысутнічае ў аповесці ў некалькіх формах.

Найбольш відавочнай адсылкай да Бібліі выступае назва пагорка на сядзібе Петрака і Сцепаніды – Галгофа. Праз такую назву ўводзіцца асацыяцыя з распяццем – пакутамі, закліканымі выкупіць грахі. З аднаго боку, гэта дазваляе падкрэсліць цяжкасці, з якімі сутыкаюцца героі; з іншага боку, апеляцыя да евангельскага сюжэта надае пакутам вышэйшы сэнс – за імі бачыцца лепшая будучыня, «уваскрасенне». Паралель з узыходжаннем Хрыста на Галгофу назіраецца ў тым, што Пятрок самастойна робіць крыж, які стае сімвалам гора і надзеі на паратунак. Тым не менш, крыж хутка знішчаюць, што выяўляе асаблівасць тагачаснага грамадства, у якім праявы рэлігіі ўспрымаліся як варожыя.

Паказальнай у плане стаўлення да рэлігіі з'яўляецца сцэна з усталяваннем крыжа: «Памажы, Божа, не адступіся ад рабоў тваіх, – прабубніў ён [Пятрок], хрысцячы спатнелы, спакутаваны за гэтыя дні твар. Яна [Сцепаніда] таксама перахрысцілася, падумаўшы: а мо і праўда паможа? Адвядзе праклён ад гэтай клятай людзьмі і Богам зямлі» [1, с. 164]. Звяртаючыся да Бога з малітвай, Пятрок «прабубніў» некалькі слоў; думкі Сцепаніды не ствараюць уражання, што яна напраўду верыць у Божую дапамогу. Дадзеная сцэна лаканічна акрэслівае герояў як людзей, якія вераць у Бога, але толькі ў пэўнай ступені спадзяваюцца на яго. «Па натуры сваёй Пятрок быў чалавек ціхі і мяккі – гэткі, якімі была большасць у Выселках: страхавіты, зважлівы, трохі набожны» [1, с. 232–233], – «набожны», але толькі «трохі», што выступае адной з ключавых характарыстык сялян.

У прыведзенай вышэй цытаце выяўляецца характэрнае спалучэнне – людзі і Бог, якое сустракаецца ў розных варыяцыях у некалькіх фрагментах: «Калі не людзей, дык пабаяліся б Бога» [1, с. 199]; «Што яна зрабіла не так, напроціў Бога і сумлення» [1, с. 122]. У супастаўленні Божага і чалавечага бачыцца дзве крыніцы маралі, якой кіруюцца героі. Першая звязваецца з хрысціянствам, другая – з «людскай» мараллю, сфармаванай традыцыйнымі ўяўленнямі пра дачыненні з іншымі. Спалучэнне дзвюх традыцый дае магчымасць выявіць асаблівасці іх камбінавання, пераасэнсавання як характарыстыку нацыянальнага светапогляду, выведзенага ў творы праз асэнсаванне свету сялянамі.

Адным з ключавых пытанняў, якія вызначаюць мараль, выступае апазіцыя дабра і зла, іх сутнасць і размежаванне. Дабро і зло выяўляюцца ў аповесці найперш праз маральныя якасці персанажаў: размежаванне людзей на сваіх і чужых адбываецца на падставе іх учынкаў. Так, Лявон, які заступаецца за сялян, характарызуецца як добры, свой чалавек, тады як Гуж, злапамятны, помслівы, выслужлівы перад немцамі, – як злы, чужы. Рэлігійная прыналежнасць выступае сродкам ідэнтыфікацый толькі часткова. У згадцы пра лёс мястэчковых яўрэяў немцы характарызуюцца наступным чынам: «Але гэтыя разумныя так меркавалі, што не павінны пабіць, што і немцы людзі, ды і ў Бога вераць» [1, с. 218]. Аднак падобнае ўражанне апынаецца зманлівым, што паказвае хісткасць веры як спосабу

вызначэння маральных якасцей чалавека. Прычым так ідэнтыфікуюць сябе яўрэі, але не беларускія сяляне, якія жывуць у хрысціянскай традыцыі.

Ацэньваючы ўчынкі немцаў, Пятрок думае: «Хіба гэта па-людску? Калі не людзей, дык пабаяліся б Бога, Бог жа ўсё бачыць. Мусіць, ён ім яшчэ спомніць іхнія зладзействы на чужой зямлі» [1, с. 199]. Апеляцыя да Бога гаворыць пра страх перад ім, абумоўлены яго здольнасцю караць, што мусіць выправіць злога чалавека. Дабро ў такім выпадку дазваляе пазбегнуць кары, што ў хрысціянскім кантэксце характарызуе зло як грэх, а дабро як праведнасць. Аднак страху перад Богам папярэднічае страх перад людзьмі – менавіта ў такім парадку разважае Пятрок. Разуменне дабра, такім чынам, выводзіцца за межы рэлігіі, да якой герой звяртаецца толькі тады, калі не спрацоўвае чалавечнасць, адказнасць перад людзьмі.

«Людская» мараль Сцепаніды выяўляецца ў яе ўспамінах пра 1930-ы год: калі на сходзе галасуюць за раскулачванне, Сцепаніда пярэчыць і ў выніку сыходзіць, перастае браць удзел у падобных рашэннях. Адпаведная і яе рэакцыя на раскулачванне сям'і Ладзіміра: «К чорту ўсіх вас! Рабіце што хочаце! Але без мяне!» [1, с. 177]. У рамках маралі гераіні дабро не можа шкодзіць чалавеку – адсюль непрыняцце раскулачвання аднавяскоўцаў, бо ідэалогія класавай барацьбы, якой апраўдваюцца гэтыя рашэнні, супярэчыць цэнтральнаму пункту маралі – чалавечнасці да сваіх.

Вялікую ролю ў фарміраванні маралі адыгрывае традыцыйная вясковая культура: калі кожны чалавек ведае кожнага, то стаўленне да іншага абапіраецца на веды пра яго як асобу. Акцэнт на чалавеку вытлумачваецца разуменнем, што аднавяскоўцы знаходзяцца ў той самай сітуацыі, што і самі героі, адпаведна, досвед іншых успрымаецца як патэнцыйна ўласны. Разумеючы, што дабро і зло, зробленыя іншаму, вяртаюцца да іх саміх, героі намагаюцца рабіць «па-людску». Такі прынцып адсылае да залатога правіла ў Бібліі ці іншых варыяцый той самай канцэпцыі (напрыклад, у фармулёўцы Канфуцыя).

У развагах герояў падчас вайны прысутнічае пэўная эгаістычнасць. Пятрок думае: «Аднак даў жа Бог клопату, наслаў немцаў, ці ім мала было гарадоў, мястэчак, хоць бы якіх вёсак, дык во, дабраліся і да гэтага Богам забытага хутара» [1, с. 60]. Далей ён паўтарае тое самае: «Во кара боская, – гаротна падумаў Пятрок. – За якія толькі грахі! І чаму гэта на мяне менавіта абрынулася такое? Хіба мала было ім гарадоў, мястэчак ці вёсак, нашто ім прыдаўся гэты Богам забыты хутар?» [1, с. 87]. Прыведзеныя ўрыўкі сведчаць пра лакальны характар маралі: яна працуе ў межах мікрасвету, там, дзе кожны чалавек знаёмы. Там, дзе пачынаецца невядомы свет, такая мараль не працуе – дзеля таго, каб вызначыць у свеце дабро і зло, гэты свет мусіць быць сваім.

Калі добрыя ўчынкі ўспрымаюцца героямі як правільныя, то благія патрабуюць тлумачэння і пошуку прычын. Такі акцэнт выяўляе дабро натуральным, тады як зло ідзе насуперак чалавечай прыродзе і мусіць мець

апраўданне. Пошук прычын зла засяроджваецца ў аповесці ў двух пытаннях: «“Чаму і завошта?” – пыталася яна ў сябе, не знаходзячы, аднак, адказу, і думкі яе ішлі далей, у глыб перажытага» [1, с. 122].

Пытанне «чаму» маркіруе пошук тлумачэння ўчынкаў і здарэнняў, якія канцэнтруецца на мінулым, на передумовах, якія паўплывалі на цяперашні стан. Так, прычынай злосці Гужа бачыцца раскулачванне яго бацькі [1, с. 214–215]; паводзіны Каландзёнка вытлумачваюцца нянавісцю з боку аднавяскоўцаў [1, с. 42]. Варта падкрэсліць, што адказ на пытанне «чаму» не з'яўляецца апраўданнем зла, а толькі дае героям лепш зразумець яго выток.

Пытанне «за што» выступае азнакай роспачы, страты разумення, няздольнасці патлумачыць, што адбываецца. Варта заўважыць, што словы «за што», «завошта» неаднаразова гучаць як у «Знаку бяды», так і ў іншых творах В. Быкава (напрыклад, «Мёртвым не баліць», «Сотнікаў», «Кар’ер», «Аблава», «На чорных лядах», «Жоўты пясочак»). Сцепаніда і Пятрок прамаўляюць гэтыя словы як у канкрэтных сітуацыях («Пастралялі курэй, забілі карову, застрэлілі хлопчыка – за што?» [1, с. 199]), так і разважаючы пра жыццё ў цэлым («Гэта ж паслаў Бог кару на дваіх старых – за што толькі?» [1, с. 78]).

У адрозненне ад «чаму», пытанне «за што» скіраванае на пошук крыніцы ўласных пакут, прычын свайго лёсу – гэта спроба адказаць не проста «чаму», а «чаму менавіта я», «чаму зло здарылася менавіта са мной». Засяроджанасць на сабе, уласным досведзе робіць дадзенае пытанне ключавым, бо рэфлексія над мінулым стаіць у цэнтры твора на ўзроўні сэнсу (асэнсаванне мінулага як умова існавання будучыні) і формы (рэтраспекцыя, унутраныя маналогі).

Што да рэлігійнага кантэксту пытання «за што», неабходна згадаць праблему апраўдання зла, якая распрацоўвалася такімі філосафамі і тэолагамі, як Плацін, Аўгустын, Ірыней Ліёнскі, Г. Лейбніц. Прысутнасць зла ў свеце ставіць эпістэмалагічнае пытанне пра мэтазгоднасць веры ў існаванне Бога [5]. Жанр тэадыцэі, вядомы са старажытнасці, выступае пошукам апраўдання справядлівасці Бога, нягледзячы на існаванне зла [4, с. 11]. Пытанне пра тое, чаму пакутуе праведнік, агучанае ў Кнізе Ёва. Прычыны несправядлівасці Ёў суадносіць са светам, але не з Богам, шукаючы ва ўласных пакутах вышэйшы сэнс [4, с. 30].

У аповесці «Знак бяды» праблема зла гучыць не столькі як пытанне пра існаванне Бога, колькі як пытанне пра само зло, засяроджанае на суб’ектыўным досведзе чалавека: чаму зло існуе і за што я мушу з ім сутыкнуцца?

Да каго звернутыя пытанні «чаму» і «за што»? Героі апелююць да кагосьці, хто знаходзіцца звонку іх прасторы, да іншага ведання, якое выходзіць за межы іх свету [1, с. 138]. Тым не менш, адказы на свае пытанні героі мусяць шукаць самі ў межах уласнага мікрасвету. Калі Бог

адсутнічае ў лакальным свеце герояў, ім застаецца кіравацца «сумленнем», «людскай» мараллю, але цалкам Бог не знікае, бо персанажы пастаянна згадваюць яго. У плане прасторы атрымліваецца наступная канцэпцыя: Бог ёсць, але не «тут».

Пятрок і Сцепаніда называюць хутар «забытым Богам», што ў дадатак да прасторавай лакалізацыі наводзіць на пытанне пра час: калі хутар стаў забытым? Жыццё Петрака і Сцепаніды ўяўляе сабой паступовае пагаршэнне сітуацыі: ад надзей у маладосці яны рухаюцца да расчаравання, разумення марнасці працы і, урэшце, да разбурэння і гібелі. Цяжкасці апраўдваюцца вайной – дрэнным часам [1, с. 18, 281, 314], а лепшага часу трэба дачакацца [1, с. 25]. Прасторавая аддаленасць Бога, такім чынам, цягне за сабой і часавы разрыў: Бог ёсць, але не «цяпер».

Хрысціянскі кантэкст рэалізуецца ў аповесці праз матыў граху і выкуплення. Сцепаніда неаднаразова сутыкаецца з маральнай дылемай – пакараць ці дараваць. У 1930-м яна разважае пра чужыя рашэнні: «Можа, цяпер яму за тое пакаранне? Але ж не, хіба за такое можна караць? А завошта тады караць Ладзіміра, старую Прахорыху?» [1, с. 183]. Пятрок думае пра вайну як пра пакаранне: «Спакваля, аднак, усё сціхла, немцы паснулі, але Петрака ўсё роўна не брала на сон; гаротна і неадчэпна думалася: што ж гэта будзе? Гэта ж паслаў Бог кару на двух старых – за што толькі?» [1, с. 78]. І ў адным, і ў другім выпадку пакаранне прыходзіць звонку – гэта справядлівасць, Боская кара за грахі. Адпаведна, чалавек не мусіць караць, але спадзяецца на расплату для тых, хто чыніць яму зло [1, с. 199]. Тым не менш, у фінале аповесці Сцепаніда пакідае схаваную бомбу, як пакаранне сваім катам [1, с. 319].

Вера ў выкупленне граху паказвае, што зло не абсалютнае і можа быць ператворанае на дабро. З гэтага вынікае схільнасць дараваць, пакуты сумлення, неабходнасць «пакаяння» перад панам, што мусіць даць героям лепшую будучыню. Аднак памылкі мінулага, «грахі», становяцца для Петрака і Сцепаніды прычынай катастрофы нягледзячы на ўсе спробы выкуплення. Больш за тое, у герояў адсутнічае разуменне, у чым заключаецца «грэх», бо яны кіруюцца натуральным жаданнем лепшай будучыні для ўласнай сям'і. Калі ў рэальнасці адбываецца катастрофа, рэлігія прапануе суцяшэнне (ідэя пакутаў, ахвяры дзеля выратавання пасля смерці). Героі ж суцяшэння пазбаўленыя, бо думка пра тое, што зло мусіць быць пакараным, не паляпшае іх сітуацыі, а лакальная мараль не кранаецца пытанняў жыцця пасля смерці.

Калі хрысціянства прапануе шэраг запаветаў, на якія можна арыентавацца, то «людская» мараль нічым, акрамя памяці яе носьбітаў, не фіксуецца. «Людская» мараль засяроджваецца на яе ўзаемнасці, а яе праблема заключаецца ў адноснасці – які чалавек, такая і мараль. Ілюстратыўным выступае дыялог Сцепаніды з Недасекам, якому «не дай Бог вешаць», але калі «скажуць, дык што ж» [1, с. 220]. На фоне сцірання

хрысціянскай маралі чалавек апынаецца ў сітуацыі крызісу: з аднаго боку, гэта праблема дачыненняў з людзьмі; з іншага боку – унутраны крызіс праз адсутнасць матрыцы асэнсавання ўласнага досведу, што прыводзіць да разгубленасці, вымушае вяртацца назад, каб гэтую матрыцу выпрацаваць.

Такім чынам, мараль у аповесці «Знак бяды» складаецца з элементаў хрысціянства і «людскай» маралі, сфармаванай пад уплывам сялянскай культуры. Хрысціянскі кантэкст выяўляецца ў інтэртэкстуальных адсылках да Бібліі, выкарыстанні матываў граху і выкуплення, трактоўцы праблемы адпраўдання зла. «Людская» мараль характарызуецца лакальнасцю, прывязанасцю да канкрэтных людзей, часу і прасторы, адсутнасцю зафіксаваных норм. Камбінацыя дзвюх канцэпцый паказвае маральны крызіс, калі рэлігійны імператыў страчвае строгасць, чалавек пазбаўляецца арыенціру, а Бог успрымаецца як існы, але «тут і цяпер» адсутны.

**Літаратура**


1. Быкаў, В. Знак бяды / В. Быкаў. – Мінск: Папуры, 2022. – 320 с.
2. Лявонава, Е.А. Беларуская літаратура ХХ ст. і еўрапейскі літаратурны вопыт / Е.А. Лявонава. – Мн. : БДУ, 2002. – 128 с.
3. Мельнікава, З. П. Супрацьстаянне дабра і зла: тыпалогія герояў аповесці В. Быкава “Знак бяды” / З.П. Мельнікава // Рэспубліканскія Купалаўскія чытанні : зборнік навуковых прац / [рэдкал.: А.С. Садоўская (галоўны рэдактар) і інш.]. – Гродна, 2019. – С. 79–86.
4. Щедровицкий, Д. Беседы о Книге Иова. Почему страдает праведник? / Д. Щедровицкий. – 4-е изд. – М.: Теревинф, 2012. – 235 с.
5. Tooley, M. The Problem of Evil / M. Tooley // The Stanford Encyclopedia of Philosophy [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://plato.stanford.edu/entries/evil. – Дата доступу: 31.03.2024.



**M.V. Yaromka**
Belarusian State University
e-mail: maryna.yaromka@gmail.com


## The concept of morality in V. Bykaŭ’s novella «Sign of Misfortune»


*Key words: «good – evil» opposition; «own – alien» opposition; the concept of morality; «Sign of Misfortune»; Vasil Bykaŭ.*



*The article reflects on the concept of morality in V. Bykaŭ’s novella «Sign of Misfortune», which is charachterised as localised (bound to the well-known world), involves a combination of Christian and «common» morality based on rural life experience. The problem of good and evil is developed by means of characters’ moral qualities, references to the Bible, motives of sin and redemption, meaning of the questions «why» and «for what».*